Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ
і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 37 (507) | Субота, 15 снежня 1962 г. | Цана 1 кап.

## У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ

*13 снежня адбудзецца агульнауніверсітэцкі партыйны сход. У наступным нумары чытайце справаздачу аб гэтым сходзе.*

*У наступным нумары будзе апублікавана таксама справаздача аб XVII камсамольскай канферэнцыі БДУ, якая адбудзецца заўтра.*

*Кафедра і кабінет палітычнай эканоміі арганізавалі эканамічную канферэнцыю студэнтаў, аспірантаў і выкладчыкаў кафедр грамадскіх навук БДУ з удзелам канструктараў, інжынераў-эканамістаў і наватараў вытворчасці прадпрыемстваў горада Мінска. Тэма канферэнцыі — «Тэхнічны прагрэс і яго значэнне ў народнай гаспадарцы». У наступным нумары мы апублікуем выступленне загадчыка кабінета палітычнай эканоміі Н. А. Яравікова, у якім ён раскажа аб гэтай канферэнцыі.*

Так працуюць нашы выпускнікі

## Па сцежках народнай славы

*Была нядзеля. У гэты дзень звычайна няма заняткаў у школе. І таму нядзіўна жыхарам вёскі Іванічы, чаму гэта з усіх канцоў населенага пункта ды і з навакольных сёл Чырвоны Бераг і Слабада ў школу спяшалася гамалівая вясёлая дзетвара. У ва ўсіх — прыўзняты настрой. А юным школьнікам радавацца было чаму. Сёння іх чакалі цікавыя справы — заняткі гістарычнага гуртка, якім кіруе маладая настаўніца, выкладчыца гісторыі Святлана Фёдараўна Сіманькова (якая закончыла сёлета гістфак БДУ. — Заўвага рэд. «Бел. універсітэт»).*

*На гэты раз юныя гісторыкі рашылі правесці заняткі на свежым паветры, у паходзе па партызанскіх сцежках свайго сельсавета. Удзельнічаць у гэтым цікавым падарожжы дзеці запрасілі аднавяскоўцаў — былых партызан. Мікалай Рыгоравіч Жлобіч, Мікалай Канонавіч Верын і дырэктар Іваніцкай васьмігадовай школы Васіль Адамавіч Шуша павялі рабят незабыўнымі сцежкамі, дарогамі векапомнай славы геройскіх дзён змагання з фашысцкімі акупантамі. Народныя ідцы паказалі дзецям явачныя :цы партызан, месцазнаходжанпартызанскага лагера, на якім яшчэ захаваліся зямлянкі — баявое жыллё мужных змагароў за незалежнасць сваёй бацькаўшчыны.*

*А пад вечар каля партызанскіх могілак ярка ўспыхнула зыркае полымя піянерскага кастра. З кароткай прамовай «Аб ролі партызан у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.» выступіла Святлана Фёдараўна. Потым дзеці спявалі партызанскія песні расказвалі вершы аб героях-партызанах.*

*Незвычайна ўзбуджаныя, поўныя непаўторных уражанняў, вярталіся дадому іваніцкія школьнікі. З сабою яны прынеслі шмат цікавых рэчаў. Гэта для гістарычнага музея, які арганізоўваецца ў школе.*

І. ПАНЦЯЛЕЙ.

(З газеты «Уперад» ад 5 снежня. Гор. Чэрвень).

### Да ведама дэлегатаў XVII камсамольскай канферэнцыі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна

XVII камсамольская канферэнцыя пачне сваю работу 16 снежня ў 10 гадзін у актавай зале галоўнага корпуса.

**Рэгістрацыя дэлегатаў у 9 гадзін у вестыбюлі 4 паверха.**

## *Паездка ў Маскву*

Нядаўна мы, студэнты 4 курса гістарычнага факультэта, пабывалі ў сталіцы нашай Радзімы — Маскве. Гэта паездка пакінула ў нас самыя цёплыя ўспаміны. Мы пазнаёміліся з гістарычнымі славутасцямі сталіцы, з помнікамі архітэктуры, творамі мастацтва. Зразумела, ажыццявіць усе нашы планы за тры дні было немагчыма. Але тым не менш, тое, што нам пашанцавала ўбачыць—Крэмль, гістарычны музеі Масквы і Барадзіна, Трацякоўская галерэя — расшырыла наш кругагляд, паглыбіла нашы веды. Мы пабывалі ў Маўзалеі Уладзіміра Ільіча Леніна.

Масква сустрэла нас дрэнным надвор'ем, ды і гасціннасцю не парадавала: у гасцініцах не было месц на 32 чалавек. Нашаму выкладчыку Б. А. Мельцару ўдалося, нарэшце, звязацца з адміністрацыяй Дома студэнтаў пры МДУ імя М. В. Ламаносава. Там чулыя і ўважлівыя людзі паклапаціліся аб нашым адпачынку. Парадавалі і сардэчныя адносіны да нас студэнтаў універсітэта. Яны дапамаглі нам зручней уладкавацца, прадаставілі нам свае пакоі.

Алена ГЛІНСКАЯ,
Тамара ЯГОРАВА.

## Гэта добра, цудоўна, правільна!

*Кафедра фізічнага выхавання і спартыўны клуб Белдзяржуніверсітэта абмеркавалі на сваіх пасяджэннях артыкул старшага выкладчыка Кіргізскага дзяржуніверсітэта Ф. Баймана, апублікаванага ў газеце «Беларускі універсітэт» 6 кастрычніка, аб тым, што вытворчая гімнастыка павінна ўваходзіць у рэжым вучэбнага дня студэнта. Ніякіх рознагалоссяў на пасяджэннях не было. Усе выказалі адну думку: «Гэта правільна, добра, цудоўна!». Ды і паглядзеўшы, усе ўмовы дазваляюць і садзейнічаюць правядзенню ў жыццё такіх мерапрыемстваў.*

*Выкладчыкі кафедры падрыхтавалі цэлы шэраг комплексаў фізічных практыкаванняў, якія будуць перыядычна абнаўляцца і змяняцца. У групах рыхтуюцца грамадскія інструктары, у абавязак якіх уваходзіць правядзенне гімнастыкі на месцах заняткаў. Кафедра фізвыхавання распрацавала метадычны дапаможнік для грамадскіх інструктараў і ўсклала адказнасць за правядзенне фізкультурных пауз на выкладчыкаў, адказных за факультэты.*

*Ды толькі аднаго не стае. На нашу думку, неабходна радыёфікаваць усе вучэбныя карпусы універсітэта. Гэта дапамагло б кожны дзень праслухаць новыя фізпрактыкаванні, і грамадскія інструктары маглі б лепш праводзіць заняткі. На прамысловых прадпрыемствах падхапілі даўно ўжо гэты слаўны пачын, які дае нядрэнныя вынікі. Само сабой зразумела, што хоць бы невялікая размінка кожны дзень — і тая ўзмацняе здароўе чалавека, павышае працаздольнасць. Прафесарска-выкладчыцкі калектыў таксама не павінен застацца ў баку ад ажыццяўлення гэтай важнай справы.*

*Р. І. ВАСІЛЕЎСКІ,
выкладчык кафедры фізвыхавання БДУ.*

## У НАШЫХ СЯБРОЎ

Больш двухсот настаўнікаў школ г. Саратава зноў сталі студэнтамі — яны пачалі займацца ва універсітэце навуковых ведаў, які мае фізічны, хімічны, геаграфічны, матэматычны, біялагічны, гістарычны і філалагічны факультэты.

Універсітэт працуе на грамадскіх пачатках. Яго мэта — азнаёміць настаўнікаў з навейшымі дасягненнямі навук, дапамагчы ім у павышэнні педагагічнага майстэрства, павысіць іх ідэйна-тэарэтычны ўзровень.

(З шматтыражнай газеты Саратаўскага дзяржуніверсітэта «Ленинский путь»).

## Гарадскі хор моладзі і студэнтаў

Мы прысутнічаем на адкрыцці новай канцэртнай залы Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Пачынаецца другое аддзяленне вялікага канцэрта. На эстрадзе—гарадскі хор моладзі і студэнтаў. Юнакі і дзяўчаты гэтага калектыву апрануты ў яркія нацыянальныя касцюмы.

Зала напоўнілася стройнай гармоніяй гукаў. Тысячы інтанацый, выразная фразіроўка, каларытныя свежыя тэмбры галасоў, малады задор выканаўцаў — усё гэта захапіла слухача, нараджаючы ў яго душы пачуццё чагосьці цудоўнага, вялікага.

Адгучэла першая песня канцэртнай праграмы хору. Зала ўспыхнула бурнымі, доўга не змаўкаючымі апладысментамі. Слухачы горача дзякавалі маладому калектыву за чароўнае выкананне.

Харысты ўсхвалявана перавялі дыханне, на іх тварах паявілася ўсмешка. «Значыць, нас прызналі, мы закранулі слухача», — думаў кожны з удзельнікаў.

Вядучы аб'явіў наступны нумар канцэртнай праграмы. Выступленне хору працягвалася...

Чытач здзіўлена паціскае плячыма: «Што за фантазія? Аб якім хоры ідзе размова?». Сапраўды, такога хору пакуль яшчэ няма ў Мінску. Гэта — пакуль яшчэ мара, але мара ажыццявімая...

У цяперашні час па ініцыятыве Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, аблсавета прафсаюзаў і гаркома камсамола ў сталіцы Беларусі ствараецца гарадскі хор моладзі і студэнтаў.

За апошнія гады ў нашай рэспубліцы самадзейнасць дасягнула выдатных поспехаў, аб чым сведчыць праводзімая ў гэтым годзе дэкада беларускага самадзейнага мастацтва. На фабрыках, заводах, у навучальных установах нарадзілася шмат новых самадзейных калектываў — танцавальных, харавых, драматычных, аркестровых. Самадзейнае мастацтва ў Беларусі становіцца масавай з'явай. У ім удзельнічаюць творча адароныя людзі самых розных узростаў і прафесій.

Як правіла, удзельнікі мастацкай самадзейнасці з'яўляюцца перадавікамі вытворчасці, членамі брыгад камуністычнай працы. Дасягненні ўдзельнікаў самадзейных калектываў часам настолькі значныя, што, бывае, цяжка павярыць таму, што на эстрадзе — аматары мастацтва, а не прафесіяналы.

Асабліваe месца сярод беларускіх самадзейных калектываў займаюць хоры. Харавое спяванне, бадай што, самае любімае мастацтва беларускага народа. Па даўняй традыцыі працаўнікі вёсак і гарадоў збіраліся разам, каб у песнях, танцах расказаць аб горкім жыцці, аб рэдкіх днях радасці. Цяпер змест народнага мастацтва ў корані змяніўся. Народ успявае героіку працы, шчасце і радасць свабоднага ад рабства чалавека, любоў да Радзімы, да Камуністычнай партыі, веру ў цудоўнае камуністычнае заўтра.

Папулярнасць харавога спявання тлумачыцца тым што гэтае мастацтва аб'ядноўвае людзей адзінай воляй, настроем, выхоўвае пачуццё калектывізму, таварысцкасці, дружбы.

Уладзімір Ільіч Ленін гаварыў, што найбольш важны той від мастацтва, які ахоплівае сваім уплывам і ўцягвае ў актыўную творчую дзейнасць вялікія масы працоўных. Харавое спяванне акрыляе чалавека, натхняе яго на вялікія ратныя подзвігі, выхоўвае пачуццё цудоўнага, любоў да музыкі.

У Беларусі ёсць нямала харавых калектываў. Многія з іх карыстаюцца заслужанай папулярнасцю. У Мінску вядомы харавыя калектывы клуба імя Дзяржынскага, Белдзяржуніверсітэта, Палаца прафсаюзаў, трактарнага завода і іншыя.

На жаль, сустракаюцца яшчэ хоры, якія працуюць нерэгулярна і часта арганізоўваюцца перад аглядамі самадзейнасці. Некаторыя кіраўнікі навучальных устаноў, прадпрыемстваў, камсамольскіх арганізацый не ўдзяляюць належнай увагі мастацкай самадзейнасці, а, між тым, менавіта мастацтва раскрывае і развівае цудоўныя якасці чалавека.

У харавых калектывах нярэдка сустракаюцца «хваробы» іншага парадку: пачынаючыя спевакі — удзельнікі мастацкай самадзейнасці звычайна імкнуцца стаць салістамі. Яны недаацэньваюць значэння хору для іх музычнага развіцця. А, як вядома, актыўнымі ўдзельнікамі хору былі многія выдатныя спевакі—Ф. Шаляпін, Л. Собінаў і іншыя. Леанід Вітальевіч Собінаў гаварыў: «Спяванне ў хоры я лічу галоўным фактарам майго вакальнага і музычнага развіцця».

Адзначаныя недахопы ў рабоце самадзейных харавых калектываў не зніжаюць, аднак, іх вялікіх поспехаў.

На наш погляд, узнікла неабходнасць стварэння ў Мінску гарадскога хору моладзі і студэнтаў па прыкладу масквічоў. Гэты хор будзе ўключаць студэнтаў, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, моладзь розных прафесій Мінска.

З хорам будуць працаваць кваліфікаваныя дырыжоры. Народны артыст СССР Р. Р. Шырма выказаў жаданне ўзначаліць гэты калектыў у якасці мастацкага кансультанта з тым, каб сваім багатым вопытам дапамагчы маладым аматарам харавога мастацтва.

Члены гэтага калектыву атрымаюць магчымасць павышаць сваю музычную адукацыю, вакальнае майстэрства. Для хору будуць арганізаваны заняткі па музычна-тэарэтычных прадметах, кансультацыі па пастаноўцы голасу, лекцыі па актуальных пытаннях мастацтва, якія будуць чытаць спецыялісты кансерваторыі і опернага тэатра.

У калектыву будуць вялікія магчымасці дэманстраваць сваё мастацтва ў лепшых канцэртных залах, па радыё, тэлебачанню рэспубліцы, удзельнічаць у конкурсах і міжнародных фестывалях моладзі.

Грамадскія і камсамольскія арганізацыі горада павінны аказаць самую непасрэдную дапамогу ў арганізацыі гэтага хору. Гарадскі хор моладзі і студэнтаў павінен стаць гонарам нашай рэспублікі.

**Н. МАЛЮГІНА,
дыпламантка дырыжорска-харавога факультэта
Белдзяржкансерваторыі.**

